# 1941

# 1945

## ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

### У прыфрантавой паласе

У гісторыю Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа з нямецка-фашысцкімі захопнікамі Мазыршчына ўпісала сваю адметную яркую старонку.

Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР Палеская вобласць перастала быць прыгранічнай. Але ўжо на шосты дзень вайна дакацілася да яе мяжы. Баі на тэрыторыі вобласці ішлі з 28 чэрвеня па 3 верасня 1941 года. Два месяцы знаходзіўся ў прыфрантавой паласе абласны цэнтр Палесся — горад Мазыр.

Своечасова, у сціслыя тэрміны была праведзена мабілізацыя ў армію. Прадпрыемствы горада пачалі працаваць на абарону. Быў сфарміраваны і пачаў дзейнічаць знішчальны батальён. На ўкамплектаванне каманднага і палітычнага складу 75-й стралковай дывізіі была накіравана група партыйных і савецкіх работнікаў горада і вобласці. Звыш 400 чалавек улілося ў склад 3-й арміі генерала В. І. Кузняцова, часці якой, выходзячы з варожага акружэння, зноў фарміраваліся ў раёне Мазыра.

Партыйныя, савецкія, камсамольскія арганізацыі Палескай вобласці прыступілі да арганізацыі спецыяльных атрадаў, якія атрымалі потым назву знішчальных батальёнаў. Яны ствараліся ў гарадах і райцэнтрах, у сельсаветах вобласці. У Мазыры, напрыклад, знішчальны батальён налічваў 300 чалавек, а асабовы склад такіх батальёнаў у вобласці — 4250 чалавек. Яны сачылі за месцамі магчымага прызямлення варожых шпіёнаў і дыверсантаў, неслі ахову чыгуначных вузлоў, станцый і іншых асабліва важных аб'ектаў, вялі разведку на фронце і ў тыле праціўніка, прымалі ўдзел у абарончых баях Чырвонай Арміі.

Баец-камсамолец Уладзімір Кіркавец з Мазырскага знішчальнага батальёна атрымаў ад адной з часцей Чырвонай Арміі заданне — разведаць размяшчэнне варожых войск у мястэчку Пціч. Ён паспяхова выканаў заданне. Дастаўленыя ім звесткі дазволілі нашай авіяцыі нанесці раптоўны і дакладны ўдар па скапленні войск і тэхнікі праціўніка. За гэты подзвіг адважны камсамолец быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Амаль адначасова з фарміраваннем знішчальных батальёнаў у гарадах і раёнах стваралася народнае апалчэнне. У яго ішлі людзі, якія па розных прычынах не падлягалі прызыву ў дзеючую армію. Толькі ў Мазыры ў ліпені 1941 г. было сфарміравана 7 атрадаў народнага апалчэння з колькасцю байцоў у іх 238 чалавек, у сельскіх Саветах — групы народнага апалчэння. Потым на базе знішчальных батальёнаў, атрадаў і груп апалчэння ствараліся партызанскія атрады.

Знішчальныя батальёны і атрады народнага апалчэння аказвалі эфектыўную дапамогу часцям Чырвонай Арміі, якія вялі баі на подступах да Мазыра.

Праводзілася вялікая работа па арганізацыі падполля і партызанскіх атрадаў. Мірнае насельніцтва было мабілізавана на будаўніцтва ліній абароны. Такія лініі ствараліся па рэках Прыпяць і Пціч. Было таксама пабудавана некалькі вузлоў абароны, прыкрытых супрацьтанкавымі равамі.

На Мазыршчыне і ў іншых раёнах Палесся дзейнічала кавалерыйская група нашых войск. На подступах да Мазыра вялі жорсткія баі 75-я стралковая дывізія генерала С. І. Нядзвігіна і часці Мазырскага ўмацаванага раёна. У той час, калі нямецкія войскі ўжо выйшлі ў раён Смаленска і Вялікіх Лук, часці Заходняга фронту працягвалі абарончыя баі на Палессі...

Нежаданне гітлераўскіх стратэгаў разгортваць шырокае наступленне ў напрамку славутых Пінскіх балот, сумна вядомых ім яшчэ з гадоў першай сусветнай вайны, дзе назаўсёды спыніўся руска-германскі фронт, а таксама баявыя дзеянні савецкіх войск, упартае, гераічнае іх супраціўленне дазволіла мясцовым партыйным і савецкім органам Гомельскай і Палескай абласцей на працягу амаль двух месяцаў выкарыстоўваць усе людскія і матэрыяльныя рэсурсы для ўмацавання фронту, эвакуацыі на ўсход людзей, прадпрыемстваў і калгасна-кааператыўнай маёмасці.

Цяжкае становішча, якое склалася ў першыя дні вайны, настойліва патрабавала хуткай перабудовы прамысловасці, транспарту, сельскай гаспадаркі на ваенны лад. Мазырская арцель «Молат» за некалькі дзён асвоіла выпуск карпусоў гранат. Усе швейныя фабрыкі і майстэрні перайшлі на пашыў ваеннага абмундзіравання і амуніцыі, а хлебазаводы — да выпечкі галет. Усе аўтамайстэрні Мазыра і раёнаў Палескай вобласці прыступілі да рамонту франтавых машын. На прадпрыемствах Мазыра значна ўзрасла прадукцыйнасць працы. Камсамольцы фабрыкі «Прафінтэрн» Мар'ян Вінцукоўскі, Міхаіл Глега, Гапаякіна, Панкраценка, Рэвут і іншыя выконвалі вытворчыя заданні на 200 і больш працэнтаў.

У ліпені 1941 г. пачалася эвакуацыя насельніцтва і матэрыяльных каштоўнасцей ва ўсходнія раёны краіны. Мазырскія фанерныя заводы «Чырвоны Кастрычнік» і «Звязда», мэблевая фабрыка «Прафінтэрн», лесазавод «Пралетарый» былі вывезены ў Архангельскую, Пензенскую, Арлоўскую і іншыя вобласці. Усяго з Мазыра і іншых раёнаў Палескай вобласці было эвакуіравана 14 буйных прадпрыемстваў. З калгасаў вывезлі або эвакуіравалі сваім ходам 66 працэнтаў буйной рагатай жывёлы, 77 працэнтаў авечак і 15 працэнтаў свіней. Была эвакуіравана і значная частка сельскагаспадарчай тэхнікі.

Масавы ратны і працоўны подзвіг мазыран знайшоў працяг і развіццё ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі ў партызанскіх атрадах і ў патрыятычным падполлі. Але перавага сіл была на баку нямецкіх войск. Чырвоная Армія 22 жніўня 1941 г. пакінула апошні яшчэ не захоплены ворагам абласны цэнтр Беларусі — Мазыр.

*А. Васько, Я. Фарбераў*

### З ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ЗАПІСКІ № 2 САКРАТАРА МАЗЫРСКАГА РАЙКАМА КП(б)Б У ЦК І ПАЛЕСКІ АБКАМ КП(б)Б АБ ХОДЗЕ МАБІЛІЗАЦЫІ Ў ЧЫРВОНУЮ АРМІЮ ПА РАЁНЕ

*24 чэрвеня 1941 г.*

Сов. секретно.

Оповещение о мобилизации в РККА по сельсоветам, колхозам, населенным пунктам Мозырского района проходило путем проведения митингов, бесед среди населения, а также вручения повесток призываемым. Трудящиеся района выразили, что они готовы выполнить

любое задание партии и правительства. Тов. Артюшенко П. И. в Бобринятах на митинге сказал, что у него имеются 2 брата, которые служат в рядах РККА. Он также идет в армию добровольцем, чтобы вместе с братьями беспощадно бить зарвавшихся фашистских гадов.

Все призываемые из сельских советов своевременно, организованно, к установленному сроку явились на сборные пункты и направлены по воинским частям, согласно указаниям райвоенкомата.

Необходимо было призвать в РККА по району 788 чел. Призвано 701 чел. 87 чел. не явились потому, что они в день мобилизации [находились] и по настоящее время находятся на спецстроительстве в гор. Минске, Калинковичах, а также часть из них ранее призвана в РККА на сборы. В числе мобилизованных призвано коммунистов 20 чел., которые активно выступали на митингах, собраниях, а также проводили политмассовую работу среди призываемых.

Усиленно проходит работа по прополке полей в большинстве колхозов района («Коминтерн», им. Ворошилова и в др.).

Необходимо было направить в РККА 253 лошади, доставлено — 223, в связи с тем, что часть лошадей для артиллерии не подошла по стандарту. Для выполнения наряда присланы другие лошади. Повозок необходимо было предоставить 124, предоставлено — 108. Недоукомплектовано за счет двухколок, которые отсутствуют в районе, заменяются одноконными...

В настоящее время парторганизация района проводит большую политмассовую работу среди населения, организуя его на поднятие политической бдительности, охрану социалистического имущества, на укрепление дисциплины и увеличение производительности* труда на социалистических полях.

Секретарь Мозырского РК КП(б)Б *Голуб*

*НА РБ. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 73. Л. 1, 2. Арыгінал.*

Падрыхтаваў да друку

*У. Лемяшонак*

* У дакуменце «продуктивности».

## З ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ЗАПІСКІ САКРАТАРА ПАЛЕСКАГА АБКАМА КП(б)Б П. А. ЛЯВІЦКАГА АБ СТВАРЭННІ І ДЗЕЙНАСЦІ ЗНІШЧАЛЬНЫХ БАТАЛЬЁНАЎ У ВОБЛАСЦІ

*8 ліпеня 1941 г.*

...В г. Мозыре истребительный батальон состоял из 300 человек... В районе от 200 до 300 чел. В связи с всеобщей мобилизацией значительная часть бойцов батальона призвана в Красную Армию. В настоящее время, по состоянию на 8 июля, в гор. Мозыре в батальоне осталось 120 человек, в районах области осталось 1276 человек, из них 1249 мужчин и 27 женщин. На вооружении истребительных батальонов и работников НКВД области имеется 974 винтовки, 3 станковых и 4 ручных пулемета. Пулеметами вооружены батальоны гор. Мозыря, Туровского района, Октябрьского и Домановичского районов...

Секретарь Полесского обкома КП(б) Белоруссии *Левицкий*

*Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Документы и материалы. Мн., 1967. Т. 1. С. 60—62.*

## ПАСТАНОВА ПАЛЕСКАГА АБКАМА КП(б)Б АБ ВЫКАНАННІ ДЫРЭКТЫВЫ ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА АБАРОНЫ СССР АД 22 ЛІПЕНЯ 1941 г.*

*23 ліпеня 1941 г.*

1. Директиву Государственного комитета обороны СССР от 22 июля принять к немедленному выполнению.

2. Обязать секретарей райкомов КП(б)Б и председателей исполкомов райсоветов и земельные органы Туровского, Житковичского, Петриковского, Копаткевичского, Глусского, Паричского, Октябрьского, Домановичского, Лельчицкого, Ельского, Василевичского, Калинковичского районов уничтожить все посевы сахарной свеклы, кок-сагыза, льна-

* З пратакола.

долгунца, конопли и других технических культур, произведенные колхозами, совхозами и другими государственными организациями, путем скашивания, скармливания, вытаптывания скотом и другими способами.

3. Из общественных или государственных посевов зерновых культур и картофеля передать остающимся колхозникам по 1,5–2 га на хозяйство. Всю остальную часть посевов зерновых культур и картофеля уничтожать путем скашивания в зеленом виде на фураж для нужд Красной Армии, скармливания и вытаптывания скотом, сжигания и т. п.

4. Обком КП(б)Б обязывает Наровлянский, Хойникский, Брагинский, Комаринский и Мозырский райкомы КП(б)Б и райисполкомы распространить действие настоящего решения в случае, если будет создаваться угроза занятия территории районов противником.

*НА РБ. Ф. 4126. Воп. 1. Спр. 2. Л. 18. Арыгінал.*

Падрыхтаваў да друку

*У. Лемяшонак*

## ПАСТАНОВА ПАЛЕСКАГА АБКАМА КП(б)Б АБ АРГАНІЗАЦЫІ БАРАЦЬБЫ Ў ТЫЛЕ ГЕРМАНСКІХ ВОЙСК

*23 ліпеня 1941 г.*

1. В соответствии с постановлением ЦК ВКП(б) об организации борьбы в тылу германских войск утвердить областную тройку по руководству подпольно-коммунистическими ячейками и партизанским движением.

5. Поручить председателю облисполкома тов. Зайцеву выделить необходимое количество денег, одежды, продовольствия и радиоприемников для партизанских отрядов и подпольных парторганизаций.

6. Предложить начальнику УНКВД тов. Строкину и первым секретарям РК КП(б)Б подготовить переход истребительных батальонов в партизанские отряды, причем руководствоваться принципом строгого индивидуального отбора каждого бойца, посылаемого в партизанские отряды.

*Всенародное партизанское движение ... Т. 1. С. 73–74.*

## Як ратавалі жывёлу

### З успамінаў Р. С. Шуера

Нарадзіўся я ў 1927 годзе ў вёсцы Раманаўка Мазырскага раёна. З 1932 г. жыў з бацькамі ў суседняй вёсцы Надаткі. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны вучыўся ў Скрыгалаўскай сярэдняй школе, збіраўся паступаць у Ленінградскае чыгуначнае вучылішча. Але не давялося. Пачалася вайна...

22 чэрвеня 1941 г. жыхароў вёскі склікалі на мітынг, які адбыўся каля школы. Старшыня калгаса А. Навуменка і яго намеснік Церашковіч паведамілі, што Германія напала на СССР і пачалася вайна. Адразу людзі не паверылі. У газетах пісалі, што Германія дружалюбная краіна, забаранялася называць яе фашысцкай, а Гітлера і Музаліні – фашыстамі. Таму паведамленне аб вайне было нечаканым. Але давялося паверыць, і некаторыя жанчыны заплакалі.

Пасля мітынгу мне і маім таварышам Віктару Казаку і Аркадзю Байдзе далі коней і даручылі ездзіць у Скрыгалаўскі сельсавет, вазіць справаздачы, а назад прывозіць распараджэнні, што паступалі туды ад вышэйшай улады.

На фронт з калгаса пайшло 47 чалавек, у тым ліку ўсе мясцовыя камуністы і 7 камсамольцаў. Кіраваць гаспадаркай даручылі пажылому калгасніку Кузьме Кадолу. У камсамольскай арганізацыі засталіся Ганна Чарэўка, Віктар Казак, Аркадзь Байда, Емяльян Мішота, Мікалай Навуменка, Уладзімір Чарэўка і я. На мяне былі ўскладзены абавязкі сакратара.

Камсамольская арганізацыя выконвала распараджэнні партыйных і савецкіх органаў: мы выходзілі на дзяжур-

ствы, сачылі, каб не парушаліся правілы святломаскіроўкі і г. д. У адно з нашых дзяжурстваў мы атрымалі распараджэнне спаліць на палях неабмалочанае збожжа або раздзяляць снапы між калгаснікамі.

У пачатку ліпеня 1941 г. паступіў загад аб эвакуацыі калгаснай жывёлы, таму што немцы падышлі да нашай вобласці. Мне і маім таварышам Віктару Казаку і Аркадзю Байдзе было даручана гнаць на ўсход калгасных кароў, цялят, валоў, коней і авечак. Гналі праз вёскі Слабада, Зімовішчы, Каменка, Навікі (мост цераз Прыпяць) і далей на Лоеў Гомельскай вобласці. Каля Мазыра нас абстраляў нямецкі разведвальны самалёт «рама». Але мы здолелі пераправіцца з жывёлай па мосце цераз Прыпяць і пагналі яе ўздоўж ракі. Тут жывёлу можна было і папасвіць. Дабраліся да вёскі Града Калінкавіцкага раёна, што ля Юравіч. Пасвілі там жывёлу каля двух тыдняў. Туды ж нам прывезлі новы загад — коней і валоў вярнуць у Надаткі. Тром камсамольцам — С. Грамовічу, П. Дробышу і М. Навуменку перадалі кароў, цялят і авечак, якіх яны пагналі далей на ўсход, а я з таварышамі коней і валоў павярнуў назад. Нашы зменшчыкі за Лоевам перадалі жывёлу мясцовым пагоншчыкам. Там нашых хлопцаў мабілізавалі ў армію.

Праз некалькі дзён мы прыгналі коней і валоў у свой калгас. Перад самай акупацыяй на нарадзе членаў праўлення калгаса з удзелам старых калгаснікаў было вырашана падзяліць калгасных коней і валоў: адзін конь або вол на дзве калгасныя сям'і. У першую чаргу надзяляліся рабочай жывёлай сем'і, з якіх хто-небудзь ваяваў на фронце.

У канцы жніўня 1941 г. праз нашы Надаткі на Казіміраўку праехалі нямецкія матацыклісты — мясцовасць апынулася ў тыле ворага. Камсамольцам давялося дзейнічаць у новых умовах. Пачалі са збору зброі і боепрыпасаў. Выходзілі на дарогі, часцей за ўсё на шлях Петрыкаў — Скрыгалаў — Мазыр, па якім нядаўна адступалі чырвонаармейцы і мусілі пакінуць разбітыя машыны і фурманкі. Падбіралі гранаты, патроны, вінтоўкі. Сам я знайшоў некалькі соцень патронаў, дзве скрынкі гранат, а таварышы падабралі ручны кулямёт, аўтамат, некалькі вінтовак. Усё гэта хавалі ў патаемных месцах у лесе. Так для нас, учарашніх школьнікаў, пачаліся чорныя дні фашысцкага «новага парадку», з якім кожны сумленны чалавек змагаўся, як толькі мог...

## Чэкісты ў сорак першым

**З успамінаў А. Г. Скокава, былога супрацоўніка Палескага абласнога ўпраўлення НКУС**

Я працаваў у Палескім абласным упраўленні НКУС упаўнаважаным сакрэтна-палітычнага аддзела. Напярэдадні вайны быў пасланы на курсы пры вышэйшай школе НКУС СССР, вярнуўся ў Мазыр у красавіку 1941 г. Мяне прызначылі намеснікам начальніка аддзела, а ў пачатку вайны — яго начальнікам.

У ноч на 22 чэрвеня 1941 г. увесь асабовы склад упраўлення працаваў да 2—3 гадзін ночы, ніхто не ішоў дамоў. У 4 гадзіны 20 мінут памочнік дзяжурнага па НКУС Васільеў паведаміў, што германскія войскі напалі на нашу краіну. Намеснік начальніка ўпраўлення НКУС Р. І. Слепаў выклікаў усіх супрацоўнікаў па трывозе. (Начальнік аблупраўлення НКУС І. Н. Івашчанка напярэдадні выехаў у службовую камандзіроўку ў Беласток.) На нарадзе Слепаў сказаў, што германскія войскі перайшлі граніцу, вядуць баі з нашай арміяй, а нямецкая авіяцыя бамбіла Кіеў. Аб'явіў для ўсіх супрацоўнікаў НКУС казарменнае становішча.

У панядзелак прыехаў І. Н. Івашчанка і на нарадзе расказаў, што на

дарогах у раёне Беластока бачыў страшныя вынікі вайны — загінуўшых людзей, разбітыя аўтамашыны. Ён паставіў супрацоўнікам аддзелаў канкрэтныя задачы аператыўнай работы і сказаў: «Не выключана, што нам прыйдзецца часова пакінуць сваю тэрыторыю. Вораг яе можа захапіць, таму трэба стварыць падполле...»

У раённыя аддзелы перадаваліся ўказанні І. Н. Івашчанкі па арганізацыі патрыятычнага падполля. Рабіў гэта і я. У Мазыры было створана каля 10 падпольных груп на выпадак акупацыі горада.

У пачатку ліпеня 1941 г. мяне выклікаў І. Н. Івашчанка. Ён сказаў, што ў абласным камітэце партыі фарміруецца абласная тройка, куды патрэбен супрацоўнік упраўлення НКУС. Задача тройкі — аб'яднаць работу ўсіх органаў, якія займаюцца стварэннем падполля, арганізацыяй партызанскага руху ў вобласці, і, магчыма, застацца на акупіраванай ворагам тэрыторыі. Вырашана ўключыць у тройку і мяне. У дапамогу Івашчанка выдзеліў маладога і энергічнага работніка контрразведвальнага аддзела ўпраўлення Чыгіра. У гэты ж дзень я быў выкліканы да першага сакратара Палескага абкама КП(б)Б П. А. Лявіцкага, дзе ўжо былі старшыня аблвыканкама Т. Г. Зайцаў, першы сакратар Мазырскага гаркама партыі Кавалёў. Тройка займалася пытаннямі забеспячэння падполля зброяй, прадуктамі і г. д. На пасяджэнні выслухалі мяне, што зроблена і робіцца ўпраўленнем НКУС па забеспячэнні ўсім неабходным створанага падполля.

Дадзеныя мне партыйнымі органамі і органамі НКУС даручэнні былі ў асноўным выкананы. Падрыхтаваны для работы ў тыле ворага спецгрупы. Для кіраўніцтва імі і іншымі падпольнымі арганізацыямі пакінуты некалькі вопытных супрацоўнікаў НКУС, што прыбылі з заходніх абласцей Беларусі. Сярод іх былі Мурзікаў і Пазнякоў. Яны добрасумленна выконвалі даручэнні. Пазнякова потым выдаў здраднік, яго расстралялі ў пачатку 1942 г., а Мурзікаў і іншыя пайшлі ў партызанскі атрад.

На адным з пасяджэнняў тройкі мне было даручана арганізаваць склад медыкаментаў і перавязачных сродкаў, каб перадаць іх потым у партызанскія атрады. Да вайны я добра ведаў фельчара Мазырскай санэпідстанцыі М. Я. Рудніцкага. Ён без ваганняў згадзіўся з маёй прапановай прыняць удзел у арганізацыі склада і дапамагчы будучаму атраду медыкаментамі.

У першыя дні вайны паступіла распараджэнне аб пасылцы 5 супрацоўнікаў контрразведкі з Мазыра ў Пінск на дапамогу мясцоваму ўпраўленню НКУС. Праз некаторы час стала вядома, што тры супрацоўнікі з пасланых загінулі ў Пінску. На жаль, прозвішчы іх засталіся невядомымі.

Адным з важнейшых мерапрыемстваў у тыя дні было стварэнне знішчальных батальёнаў. Яны лавілі варожых парашутыстаў, папярэджвалі паніку, нярэдка ўдзельнічалі ў эвакуацыі калгаснай жывёлы ў савецкі тыл. Супрацоўнікам упраўлення, якія знаходзіліся ў раёнах, было сказана, што ў выпадку, калі раёны будуць захоплены ворагам, яны павінны ўступіць у партызанскія атрады.

Вайна толькі пачыналася, але ўжо былі страты. У ліпені 1941 г. у Дамановічах пры бамбардзіроўцы райцэнтра загінуў Барыс Хайкін.

У пачатку вайны немцы, каб забяспечыць паспяховы рух сваіх войск у глыб нашай краіны, часта арганізоўвалі ў прыфрантавых раёнах правакацыі, сеялі паніку сярод насельніцтва. Звычайна звесткі, атрыманыя ад невядомых па тэлефоне, не пацвярджаліся. Але былі сігналы і іншага характару. Неяк з Калінкавіцкага аддзела НКУС паведамілі, што падбіты нямецкі самалёт зрабіў у полі вымушаную пасадку. Па трывозе быў падняты знішчальны батальён, якім камандаваў Мятліцкі. Байцы батальёна вялі бой з нямецкімі лётчыкамі, якія знялі з самалёта буй-

накаліберны кулямёт, іншае ўзбраенне і доўга супраціўляліся. Байцы ўзялі ў палон лётчыка і перадалі яго ў абласны ваенкамат, а стралок і радыст былі забіты.

Жнівеньскія дні 1941 г. былі заняты арганізацыяй сувязі паміж падполлем Мазыра і раёнаў вобласці. 20 жніўня па заданні сакратара АК КП(б)Б Турыка і старшыні аблвыканкама Зайцава я з супрацоўнікам Чыгіром выехаў у Хойніцкі і Брагінскі раёны, каб падрыхтаваць базы ўзбраення і харчоў, наладзіць з мясцовым кіраўніцтвам сувязі.

20—21 жніўня 1941 г. у Брагіне мы займаліся стварэннем партызанскага атрада. У яго былі ўключаны работнікі партыйнага апарата, міліцыі і іншыя актывісты. Турык і Зайцаў паехалі ў Чарнігаў, дзе ў гэты час знаходзіўся штаб 21-й арміі, членам Ваеннага савета якой быў П. А. Лявіцкі.

Калі яны вярнуліся ў Брагін, нам было прапанавана адшукаць начальніка Палескага ўпраўлення НКУС І. Н. Івашчанку і паступіць у яго распараджэнне. У канцы жніўня мы знайшлі Івашчанку ў Болхаве Арлоўскай вобласці. Ён сказаў, што па ўказанні Наркамата ўнутраных спраў СССР усе супрацоўнікі органаў з Палескай вобласці павінны на месцы кіраваць партызанскім рухам і патрыятычным падполлем. Нам было загадана выехаць на фронт у напрамку Палескай вобласці і па заданні асобых аддзелаў весці разведку праціўніка. Шлях наш ляжаў назад, у занятую к гэтаму часу ворагам вобласць.

## Чорныя дні акупацыі

Акупіраваўшы Палессе, Мазыр і раён, гітлераўцы пачалі ўстанаўліваць свой «новы парадак». Людзі пазбаўляліся ўсіх правоў на чалавечае існаванне, бо знішчаліся ўстановы культуры, асветы, аховы здароўя, а ўрэшце гэта быў крывавы чалавеканенавісніцкі рэжым масавага знішчэння насельніцтва.

Тэрыторыя Беларусі была падзелена на часткі. Паўднёвыя раёны Палескай, Гомельскай і Брэсцкай абласцей былі адарваны ад Беларусі і далучаны да рэйхкамісарыята Украіны. На Палессі ўтварылі чатыры акругі — Мазырскую, Васілевіцкую, Ельскую і Петрыкаўскую, якія падпарадкоўваліся житомірскаму гебітскамісарыяту. У гарадах і райцэнтрах з'явіліся назначаныя акупантамі бургамістры, у сельскай мясцовасці — старасты. Былі створаны паліцэйскія ўчасткі, лагеры, гета.

Кожнага, хто выклікаў хоць невялікае падазрэнне акупацыйных улад, арыштоўвалі, адпраўлялі ў турмы ці лагеры, адкуль мала хто мог выйсці жывым. У першую чаргу забівалі камуністаў, камсамольцаў, савецкіх работнікаў, калгасных актывістаў. Поўнаму знішчэнню падлягала яўрэйскае насельніцтва Мазыра і раёна. З восені 1941 г. па вясну 1942 г. адбываліся масавыя расстрэлы яўрэяў, якія не паспелі эвакуіравацца ў савецкі тыл.

З ростам партызанскага руху, узмацненнем супраціўлення захопнікам узмацняліся і рэпрэсіі. У шалёнай ярасці гітлераўцы знішчалі мірнае насельніцтва, жанчын, дзяцей, старых. Часта людзей забівалі па стандартным абвінавачанні «за сувязь з партызанамі».

Ад расстрэлаў асобных людзей гітлераўцы перайшлі да масавага знішчэння насельніцтва многіх вёсак раёна. 22 сакавіка 1943 г. у вёсцы Казіміраўка былі расстраляны 358 чалавек, у тым ліку жанчыны і дзеці, спалена 76 хат. У той жа дзень у Будзе Казіміраўскай было забіта 127 жыхароў, спалена 32 хаты. У чэрвені 1943 г. была спалена вёска Раманаўка, забіта 30 сялян.

Жудасную расправу ўчынілі гітлераўцы над жыхарамі вёскі Касцюковічы, дзе 30 чэрвеня 1943 г. былі кінуты